Не прапусціце!

## ВЯЛІКІ — МАЛЫМ

**Сёння, у Міжнародны дзень абароны дзяцей, Вялікі тэатр Беларусі адчыняе дзверы для маленькіх і самых маленькіх гледачоў**

**Толькі ў гэты дзень можна апынуцца «На прыёме ў Караля», «У гасцях у Снежнай каралевы», на «Кірмашы казак», паспяваць разам з артыстамі вядомыя дзіцячыя песні, пачуць музычную казку Сяргея Пракоф'ева «Пеця і Воўк», разгадаць цікавыя музычныя загадкі, паўдзельнічаць у інтэрактыўных гульнях, здзейсніць «Падарожжа ў свет музыкі і казкі», акунуцца ў «Салодкае жыццё», пабываць у «Майстэрні мастака» і нават стварыць эскіз да спектакля.**

А якое ж свята без сэлфі? Гасцей тэатра чакаюць маляўнічыя фотазоны з рэквізітам з дзіцячых спектакляў, а таксама гасціныя з казачнымі персанажамі. Можна пабываць на рэпетыцыях артыстаў, наведаць музычны і танцавальны майстар-класы. І ўсё гэта дазволена фатаграфаваць!

А яшчэ дзяцей і дарослых чакае шоу мыльных бурбалак, а шаноўную публіку пацешаць жанглёры і артысты на хадулях. Завершыцца святочная праграма на пляцоўцы каля галоўнага ўваходу — сваім майстэрствам здзівяць артысты тэатра вогненных і светлавых паказаў.



Кошт білетаў у гэты дзень сімвалічны: для непаўналетніх (да 18 гадоў) — 5 руб., для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — бясплатна, для членаў шматдзетных сем'яў — 3 руб., для ўсіх астатніх — 7 руб. Білеты можна набыць у дзень свята ў касах тэатра. І майце на ўвазе, што праграма разлічана на пяць гадзін: пачатак у 14.00, завяршэнне ў 19.00.

**Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ.**

# ДЗЯЦІНСТВА — НАЙЛЕПШАЯ КРАІНА

## КОЛЬКАСЦЬ ІНТЭРНАТАЎ ЗНІЖАЕЦЦА

З 1996 года ў нашай краіне працуе Камісія па правах дзіцяці. Яе ўпаўнаважаныя штоквартальна праводзяць прыёмы. Сёлета такіх адбылося 62, у тым ліку 17 выязных. Як адзначыла **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена ВАЙЦЯХОВІЧ**, да ўпаўнаважаных камісіі звяртаюцца пераважна бацькі з прычыны спрэчак у выхаванні дзяцей.

— 1 чэрвеня — дзень, калі мы гаворым не толькі пра свята, але і пра тыя вострыя пытанні, якія датычацца абароны правоў дзяцей, — падкрэсліла Алена Вайцяховіч. — Больш за 19 тысяч дзяцей з дзевяці тысяч сем'яў знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Дзяржаўнымі органамі праводзіцца работа, накіраваная на тое, каб аказаць дапамогу гэтым сем'ям у пераадоленні складанай жыццёвай сітуацыі, каб дзеці засталіся з бацькамі.

Сёння ў Беларусі каля 15 тысяч дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Летась выяўлена 2 236 такіх дзяцей. Але гэты паказчык паступова зніжаецца — для параўнання, у пачатку 2010-х выяўлялася больш за чатыры тысячы такіх дзяцей штогод.

— Трэба адзначыць, што большая іх частка — не сіроты, а дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, — дадае Алена Вайцяховіч.

Такіх малых сёння ўсё часцей імкнуцца ўладкаваць у прыёмныя сем'і. Больш за 88 % з іх жыве ў замяшчальных сем'ях. Больш за сем тысяч усыноўлена і выхоўваецца ў сем'ях усынавіцеляў. Штогод на сямейныя формы выхавання ўладкоўваецца больш за 80 % дзяцей, якія засталіся без папячыцельства.

Колькасць дзіцячых інтэрнатных устаноў у краіне аптымізавана і працягвае скарачацца. У канцы 1990-х такіх устаноў у Беларусі было каля паўсотні, цяпер жа дзейнічае дзесяць дзіцячых дамоў і дзве школы-інтэрнаты для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Развіваюцца і такія формы пражывання, як дзіцячая вёска і дзіцячы гарадок — іх створана пяць.

Актыўна развіваюцца сямейныя формы ўладкавання. Сёння ў Беларусі функцыянуе 309 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу і 1505 прыёмных сем'яў. Найбольшая колькасць дзіцячых дамоў сямейнага тыпу ў Брэсцкай вобласці — 54, яшчэ два рыхтуюцца да адкрыцця. У Мінскай вобласці таксама актыўна развіваюцца дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, тут іх 43.

Шырока распаўсюджана і апека — пад ёй знаходзіцца больш за сем тысяч дзяцей. Як правіла, такая форма прадугледжвае, што блізкія сваякі прымаюць дзяцей у сваё сем'і.

## БЯСПЛАТНЫ ДЗЁННЫ ЛАГЕР

З 1 чэрвеня стартуе і дзіцячая аздараўленчая кампанія, у тым ліку ў дзённых лагерах. Як расказала **начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ганна РЫСЯВЕЦ**, сёлета ў Мінску для малодшай узроставай групы 6–10 гадоў цалкам адменена бацькоўская даплата. Для сярэдняй і старэйшай узроставай груп яна мінімальная.



— Мінск традыцыйна з улікам прыцягнення сродкаў мясцовага бюджэту сур'ёзна падыходзіць да аздараўлення дзяцей-інвалідаў, — дадала спецыяліст. — Сёлета 93 дзіцяці з кардыялагічнай паталогіяй і 22 з цукровым дыябетам пройдуць аздараўленне ў комплексе «Ракета» ў суправаджэнні бацькоў. На працягу некалькіх гадоў на базе лагера «Юбілейны» ажыццяўляецца аздараўленне дашкольнікаў ад 3 да 5 гадоў. І сёлета 23 дзіцяці трапяць у гэты загарадны аздараўленчы лагер.

## КАНФІДЭНЦЫЯЛЬНАСЦЬ ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ

У клопаце пра псіхічнае і фізічнае здароўе падлеткаў ключавую ролю адыгрываюць цэнтры, дружалюбныя падлеткам. Як расказала **намеснік дырэктара па педыятрыі РНПЦ «Маці і дзіця» Алена УЛЕЗКА**, у Беларусі дзейнічае 58 такіх цэнтраў. Сярод мэт іх дзейнасці — не толькі захаванне псіхічнага, рэпрадуктыўнага здароўя падлеткаў і іх саматычнага стану, але і фарміраванне імкнення да здаровага спосабу жыцця і сацыялізацыя ў грамадстве. Прынцыпы гэтых цэнтраў блізкія для ўсіх падлеткаў: даступнасць, дабравольнасць, давер, добразычлівасць і канфідэнцыяльнасць. Там праводзяцца як індывідуальныя, так і групавыя кансультацыі, магчымыя анлайн-кансультацыі і па тэлефоне. Пры неабходнасці супрацоўнікі цэнтраў накіроўваюць дзяцей да розных спецыялістаў. Летась у цэнтрах праведзена больш за 4,5 тысячы мерапрыемстваў з удзелам 150 тысяч маладых людзей.

## ДАПАМОГІ І ВЫПЛАТЫ

Асноўным кампанентам падтрымкі сем'яў з дзецьмі з'яўляецца сістэма дзяржаўных дапамог, адзначае **галоўны спецыяліст упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Крысціна РАМАНОЎСКАЯ**. Імі ахоплена кожнае чацвёртае дзіця ў краіне, а дзеці да трох гадоў — на 100 %.

Асаблівым клопатам дзяржавы з'яўляюцца сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў (сёння іх у краіне амаль 38 тысяч). Найперш гэта шэраг выплат. Дзецям-інвалідам да 18 гадоў прызначаецца сацыяльная пенсія, памер якой дыферэнцаваны ў залежнасці ад ступені страты здароўя — ад 80 да 110 БПМ. Цяпер яе сума складае ад 282 да 387 рублёў.

Да трох гадоў дапамога па доглядзе такога дзіцяці прызначаецца ў павышаным памеры — 45 % ад сярэдняй зарплаты работніка ў краіне. Цяпер гэта 779 рублёў. На дзіця-інваліда, старэйшага за тры гады, штомесячна выплачваецца дапамога ў памеры 70 % БПМ, а калі ў сям'і ёсць і іншыя дзеці, старэйшыя за тры гады, то на кожнага з іх прызначаецца дапамога ў памеры 50 % БПМ. Існуе яшчэ адзін від дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда да 18 гадоў, яго памер устаноўлены ў залежнасці ад узросту і ступені страты здароўя — ад 100 % да 120 % БПМ. Акрамя таго, бацькам прапануюцца паслугі нянькі і сацыяльная перадышка.

Адна з сацыяльных гарантый — тэхнічныя сродкі рэабілітацыі. У цяперашні час з 59 найменняў 50 выдаюцца дзецям-інвалідам бясплатна. З іх 90 %, уключаючы каляскі розных тыпаў, трохколавыя веласіпеды, пратэзы, артэзы, артапедычны абутак, слыхавыя апараты, выдаюцца бясплатна і 10 % сродкаў рэабілітацыі выдзяляецца на ўмовах частковай аплаты (ад 10 да 50 % кошту). Ёсць шэраг іншых ільгот: бясплатнае забеспячэнне лекавымі сродкамі, бясплатны выраб зубных пратэзаў, бясплатнае санаторна-курортнае аздараўленне і лячэнне, бясплатны праезд на грамадскім транспарце.

## АКТЫЎНЫЯ Ў ПОШУКУ РАБОТЫ

Працоўны кодэкс прадугледжвае магчымасць працаўладкавання з 16 гадоў, а пры пісьмовай згодзе аднаго з бацькоў — з 14-ці, нагадвае Крысціна Раманоўская. Вызначаны і пералік работ, якія могуць выконваць падлеткі з 14 гадоў. Пры гэтым моладзь мае права рэгістравацца ў якасці беспрацоўных з 16 гадоў.

— Сур'ёзнай перавагай моладзі на рынку працы з'яўляецца бясплатная магчымасць атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Пры гэтым дзяржава гарантуе выпускнікам дзяржаўных навучальных устаноў пры ўмове навучання за кошт бюджэту першае працоўнае месца шляхам размеркавання, — звяртае ўвагу спецыяліст.

З агульнай колькасці выпускнікоў устаноў прафесійнай адукацыі ў якасці беспрацоўных летась звярнулася ў службы занятасці па садзейнічанне ў працаўладкаванні больш за паўтысячы, з іх 179 — выпускнікі з вышэйшай адукацыяй, 326 чалавек з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, 29 — з прафесійна-тэхнічнай. Працаўладкавана 465 чалавек — 87 % ад усіх, хто звярнуўся.

— Маладзёжны рынак працы ў нашай краіне характарызуецца невысокім узроўнем беспрацоўя сярод насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў. У лютым 2023 года, паводле даных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, ён склаў 6,3 %. Год таму гэты паказчык быў 7,1 %, — расказвае Крысціна Раманоўская.

Асноўнымі напрамкамі работы з моладдзю на рынку працы, па-першае, з'яўляецца браніраванне працоўных месцаў для тых, хто ўпершыню шукае работу ва ўзросце да 21 года. У 2022 годзе працаўладкавана 9,1 тысячы беспрацоўнай моладзі ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў, у тым ліку 702 чалавекі, якія ўпершыню шукалі работу ва ўзросце да 21 года, а таксама 272 чалавекі — за кошт броні.

Па-другое, ажыццяўляецца працаўладкаванне для атрымання практычнага вопыту работы па атрыманай прафесіі на часовыя працоўныя месцы. Наймальнікам, якія выдзяляюць такія працоўныя месцы, часткова кампенсуюцца затраты на аплату іх працы. Летась 342 беспрацоўным ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў аказана садзейнічанне для атрымання практычнага вопыту.

Па-трэцяе, гэта арганізацыя прафесійнага навучання. Яно праводзіцца па прафесіях, запатрабаваных на рынку працы. У цяперашні час яно ажыццяўляецца больш чым па 100 прафесіях, у тым ліку можна прайсці курс навучання асновам прадпрымальніцкай дзейнасці. Летась на навучанне накіраваны 951 беспрацоўны з ліку моладзі, а гэта 28 % ад накіраваных на навучанне.

Па-чацвёртае, арганізоўваецца часовая працоўная занятасць моладзі ў вольны ад вучобы час. Штогод колькасць працаўладкаванай моладзі павялічваецца. Летась з фінансавай падтрымкай дзяржавы аказана садзейнічанне ў працаўладкаванні на часовыя працоўныя месцы 38 тысячам навучэнцаў. Сёлета за чатыры месяцы працаўладкавана ўжо амаль шэсць тысяч маладых людзей.

— Маладыя людзі актыўныя ў пошуку работы, — падкрэслівае Крысціна Раманоўская. — Рэспубліканскі кірмаш вакансій, які праходзіў сёлета з 15 да 19 мая, наведала больш за 28 тысяч маладых людзей. З іх дамовіліся з наймальнікамі 10,7 тысячы, у тым ліку 7,2 тысячы непаўналетніх. Усяго 2,3 тысячы наймальнікаў прапанавалі 30 тысяч вакансій.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*